PolotskSU



УДК 351.853.3(476.5)+904:726.82(476.5)«13/17»

# ЭЛЕМЕНТЫ ПАХАВАЛЬНАГА АБРАДУ СЕЛЬСКАГА І ГАРАДСКОГА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ XIV–XVIII стст.

*В.У. ЧАРАЎКО*
*(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Полацк)*

*Артыкул прысвечаны элементам пахавальнага абраду сельскага і гарадскога насельніцтва Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. Разгледжаны катэгорыі пахавальных помнікаў, арыенціроўка касцяка, палажэнне рук, глыбіня і засыпка магільных ям, наяўнасць трун, надмагіллі. Большасць элементаў пахавальнага абраду гарадскога і сельскага насельніцтва супадаюць. Для гарадоў у большай ступені характэрны могільнікі пры цэрквах (хаця і не абавязкова), могілкі ў сельскай мясцовасці часцей не былі прывязаны да храмаў. Многія сельскія могілкі адрозніваюцца каменнымі надмагіллямі, наяўнасць якіх не характэрна для гарадскіх некропалей.*

Ключавыя словы: *Беларускае Падзвінне, пахавальны абрад XIV–XVIII стст., пахавальныя помнікі, пахаванні, каменныя надмагіллі.*

Уводзіны. Пахавальным абрадам называецца сістэма строга акрэсленых рытуальных і практычных дзеянняў у адносінах да цела памерлага. Матэрыяльным вынікам здзяйснення пахавальнага абраду з’яўляецца пахавальны комплекс — спецыяльна афармленае месца пахавання чалавека. Пахавальны комплекс уключае астанкі памерлага, пахавальнае збудаванне, пахавальны інвентар і, магчыма, дадатковыя структуры кшталту труны, каменных канструкцый і г.д. [1, с. 177]. Пахавальны абрад насельніцтва Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. з’яўляецца найменш вывучаным у параўнанні як з папярэдняй, так і з наступнай эпохамі. Познесярэдневяковыя пахавальныя помнікі рэгіёна не былі прадметам спецыяльнага археалагічнага вывучэння да канца XX ст. і захоўваюць актуальнасць як перспектыўны напрамак навуковага пошуку [2, с. 176–177]. Планамерных этнаграфічных назіранняў у той час не праводзілася. Інфармацыю пісьмовых крыніц нельга назваць вычарпальнай. Рэканструкцыя пахавальнага абраду магчыма пры сінтэзе даных археалогіі, фізічнай антрапалогіі і інфармацыі пісьмовых крыніц з рэтраспектыўным выкарыстаннем этнаграфічнага матэрыялу.

Асноўная частка. Для характарыстыкі пахавальнага абраду насельніцтва Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. спынімся на такіх элементах абраду, як катэгорыі пахавальных помнікаў, глыбіня і засыпка магільных ям, арыенціроўка памерлага, палажэнне рук, наяўнасць труны, надмагілляў.

Катэгорыі пахавальных помнікаў. *Сельскія пахавальныя помнікі* даследуемага перыяду прадстаўлены пашыранымі ў рознай ступені такімі катэгорыі, як познесярэдневяковыя курганы; пахаванні з каменнымі надмагіллямі, упускныя ў курганы

PolotskSU



папярэдняга перыяду; могільнікі на пляцоўках курганоў папярэдняга перыяду; могільнікі на пляцоўках гарадзішчаў папярэдняга перыяду; грунтовыя могільнікі. Уважлівы разгляд паведамленняў аб датуемых XVI ст. *познесярэдневяковых курганах* [3] указвае на іх адзінкавасць, што ставіць пад пытанне іх абгрунтаванае вылучэнне ў асобную катэгорыю пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. [4, с. 162]. Другой катэгорыяй з'яўляюцца *пахаванні з каменнымі надмагіллямі, упускныя ў курганы папярэдняга перыяду*. Такія помнікі выяўлены Г. В. Ласкавым каля в. Вышадкі Гарадоцкага раёна. Знешне курганы нічым не адрозніваліся ад іншых: былі невялікіх памераў, мелі круглыя (паўсферычныя) насыпы, каля некаторых прасочваліся раўчукі. У іх насыпы былі ўпушчаны пахаванні. Каменныя канструкцыі з невялікіх валуноў схаваны пад слоем дзёрну і адкрываліся толькі пры раскопках [5, с. 148].

*Могільнікі на пляцоўках курганоў* — наступная катэгорыя познесярэдневяковых сельскіх пахаванняў. У адрозненне ад помнікаў папярэдняй катэгорыі, колькасць упушчаных у курганны насып пахаванняў тут большая. Прыкладам служыць даследаваны аўтарам курган каля в. Жарнасекава Бешанковіцкага раёна. Стратыграфія і характар каменных канструкцый паказалі, што даследаваны насып уяўляў сабой уласна курган дыяметрам і насыпы пазнейшых грунтовых пахаванняў, што прымыкалі да кургана. У выніку натуральнага разбурэння і ажыццяўлення ўпускных пахаванняў насыпы зліліся ў адзін. Акрамя асноўнага, у кургане на розных узроўнях выяўлена яшчэ 3 пашкоджаныя ўпускныя пахаванні. Паводле высноў антрапалагічнай экспертызы, праведзенай В.А. Емяльянчык, кожнае з іх утрымлівала парэшткі двух індывідаў. Акрамя таго, у ходзе разбора насыпу знойдзены шматлікія асобныя косці і фрагменты касцей, у т.л. непасрэдна пад слоем дзёрну, што ўказвае на парушэнне касцякоў упускных пахаванняў пры ажыццяўленні новых пахаванняў. Верагодна, частка шкілетаў была парушана і не захавалася [6, с. 123–127].

Прыкладам познесярэдневяковага *могільніка на пляцоўцы гарадзішча* з'яўляюцца даследаваныя В.М. Ляўко пахаванні каля в. Новы Болецк Гарадоцкага раёна. Гарадзішча-сховішча днепра-дзвінскай культуры датуецца IV ст. да н.э. — V ст. н.э.; у X–XII (XIII) ст. на ім існавала паселішча; у больш позні час на пляцоўцы гарадзішча з'явіліся могілкі, якія датуюцца (XIII?) XIV–XV стст. [7, с. 136; 8, с. 137]. Найбольш пашыранымі былі *грунтовыя могільнікі*. Прыкладамі служаць даследаваныя М.В. Клімавым могільнікі Лучна II (узнік не раней за мяжу XII–XIII стст., перапыніў існаванне раней за канец XIV ст.) і Лучна I (другая палова XVI ст.) [9, с. 29–30; 10, с. 123].

Сельскія могільнікі, як правіла, не звязаны з культавым будынкам (храмам ці капліцай), чым адрозніваюцца ад большасці гарадскіх некропалей. Адзначым, што размешчаныя ў сельскай мясцовасці пахаванні не абавязкова належалі сялянам. Пажаданне быць пахаваным ва ўласным маёнтку часта сустракаецца ў тэстаментах шляхты Полацкага і Віцебскага ваяводстваў. Пры гэтым у якасці месца апошняга спачыну можа фігураваць любая мясцовасць, якая спадабалася тэстатару. Напрыклад, зямянін Міхаіл Скірмант прасіў пахаваць яго проста ў маёнтку Галоўчычы, Фёдар Аляксандравіч Сялява — «у маёнтку маім Відыніцкім», Іван Харкоўскі — «на грунце нашым Мішкаўскім», Балцэр Багданавіч Старасельскі — «у маёнтку маім Старым Сяле» [11,

PolotskSU



с. 33–34; 12, с. 239, 273; 13, с. 66]. Шляхціч Лука Аўсеевіч жадаў быць пахаваным «на грунце маім Мядзеленскім, на гары, за сажалкай, пад дубам», Андрэй Якубавіч Сівіцкі — «у маёнтку маім Добрыне…, у агародзе маім, пад дваром маім Добрынам, каля саду майго» [14, с. 452; 15, с. 203–205].

*Гарадскія пахавальныя помнікі* дэманструюць меншую варыятыўнасць і прадстаўлены грунтовымі могілкамі каля храмаў; грунтовымі могілкамі без культавых пабудоў; пахаваннямі ў храмах ці капліцах. Прыкладам *прыхрамавых могілак* з'яўляецца некропаль на стрэлцы Ніжняга замка ў Полацку, даследаваны Д. У. Дукам і А. Л. Коцам. Пахаванні XIII–XIV стст. гэтага могільніка суадносяцца з царквой XII ст., які мае ўмоўную назву «храм на стрэлцы Ніжняга замка» [16, с. 172–181]. Прыкладам *гарадскіх могілак без культавай пабудовы* з'яўляюцца даследаваныя Д.У. Дукам пахаванні на полацкім гарадзішчы [17, с. 112–113; 18, с. 29–31]. Познесярэдневяковыя *пахаванні ў храмах* адкрыты, напрыклад, у падвалах віцебскай Святадухаўскай царквы (даследаваны В.М. Ляўко) і пад падлогай віцебскай Благавешчанскай царквы (вывучаны Т.С. Бубенька) [19, с. 218, 221].

Пахаванні на гарадскіх прыхрамавых могілках ці ў храмах вядомы не толькі па археалагічных, але і па пісьмовых крыніцах. Пахаванымі маглі быць прадстаўнікі духавенства, шляхецкага саслоўя, мяшчане. Так, віцебскі зямянін Занка Алехнавіч Рамейка Хоцімскі ў тэстаменце выказаў пажаданне знайсці вечны спачын «у Светого Духа» [15, с. 220, 222]. Маці Сімяона Полацкага Таццяна Якаўлеўна Шараметава прасіла пахаваць яе «пры царкве Святога Багаяўлення» [20, с. 47]. Пахаванні ў храмах лічыліся больш статуснымі. Найбольш прэстыжным было месца пад алтарнай часткай. Там хавалі вышэйшае духавенства і найбольш шчодрых фундатараў і кцітараў. Пахаванне ў склепе пад алтаром глыбоцкага касцёла каштавала Яну Корсаку Галубіцкаму і Канстанцыі Корсакавай 20 200 і 7 000 злотых адпаведна. Для параўнання, пахаванне на могілках пры тым жа касцёле абышлося Разаліі Корсакавай прыкладна ў 500 злотых [21, s. 16].

Глыбіня магільных ям. Метрычныя параметры магільных ям суадносяцца з памерамі пахаваных [7, с. 137; 10, с. 122; 22, с. 22]. Напрыклад, на даследаваным аўтарам могільніку каля в. Івесь Глыбоцкага раёна глыбіня пахаванняў вагалася ад 0,51 да 1,39 м. Пры гэтым пахаванні дарослых у асноўным выяўлены на глыбіні 0,72–1,15 м (17 з 20 пахаванняў дарослых), а пахаванні дзяцей — у асноўным на глыбіні 0,51–0,73 м (5 з 8 пахаванняў дзяцей). Для гарадскіх могілак, пляцоўкі якіх выкарыстоўваліся працяглы час, характэрна размяшчэнне пахаванняў на некалькіх гарызонтах. Прыклады гэтага дэманструюць пахаванні на месцы былых саляных складоў у Віцебску [19, с. 219], некропалі на стрэлцы Ніжняга замка і на гарадзішчы ў Полацку [16, с. 172–181]. У гэтых выпадках глыбіня магілы можа ўскосна ўказваць на дацыроўку пахавання. Тое ж датычыцца некаторых сельскіх могільнікаў са шматузроўневым размяшчэннем пахаванняў. Прыкладам служыць даследаваны аўтарам могільнік каля в. Дубраўка Гарадоцкага раёна [23, с. 154–160]. Пахаванні на ім размешчаны на двух гарызонтах, ніжні з якіх узнік у XVII ст., верхні — у XVII–XVIII стст. [23, с. 154–160].

Засыпка магільных ям. Магільныя ямы заўважны не ва ўсіх выпадках. Контуры выяўленых магільных ям у большасці выпадкаў мелі падпрамавугольную форму і запоўнены шэрым (гумусаваным) пяском. У сельскіх могілках у адзінкавых выпадках фіксаваліся невялікія кавалачкі вугалю аб'ёмам каля 1 куб. см (Івесь) або гумусаваныя

PolotskSU



праслойкі (Дубраўка) [23, с. 154–160]. У засыпцы некаторых ям сельскіх могільнікаў сустракаліся камяні (часам — працяг надмагільных канструкцый, часам — дробныя каменьчыкі памерамі 1–2 см). Фрагменты керамікі, выяўляемыя ў верхніх пластах культурнага слою на сельскіх могільніках, траплялі туда ў выніку ажыццяўлення памінальных абрадаў [23, с. 154–160].

Арыенціроўка пахаванняў. Пераважная большасць пахаванняў арыенцiравана галавой на захад (пераважна) або на ўсход. Магчымы як нязначныя, так і адчувальныя адхіленні ад дакладнага геаграфічнага напрамку як да поўначы, так і да поўдня. Большасць адхіленняў ад магнітнай арыенціроўкі тлумачыцца сезоннымі ваганнямі кропак усходу і заходу сонца, па якіх вызначаліся бакі свету [24, с. 139–140]. Пахаванні з устаноўленай арыенціроўкай у цэлым арыенціраваны галавой ці на захад, ці на ўсход, што адпавядае хрысціянскай традыцыі. Магчыма, улічвалася і арыенціроўка надмагілляў суседніх пахаванняў. Заходняя арыенціроўка характэрна для праваслаўнага і, магчыма, уніяцкага насельніцтва, усходняя — для каталіцкага і ўніяцкага [19, с. 221].

Палажэнне рук гарадскіх і сельскіх могільнікаў характарызуецца значнай варыятыўнасцю, але пераважна зводзіцца да размяшчэння рук на тазавых касцях, жываце, грудзях у розных спалучэннях. Такая сітуацыя тыпова для старажытнарускага і познесярэдневяковага перыядаў і шырока фіксуецца ва ўсходнеславянскіх землях [25, с. 115; 26, с. 57–58]. Розныя варыянты прысутнічаюць у межах аднаго і таго ж могільніка. Напрыклад, з 7 пахаваннях могільніка Івесь, даследаваных аўтарам у 2013 г., палажэнне рук устаноўлена ў 4 выпадках, пры гэтым прадстаўлена трымя варыянтамі:

- правая рука пакладзена на грудзі, левая — на жывот;
- рукі складзены на тазавых касцях, правая на левай;
- левая рука пакладзена на грудзі, правая знаходзіцца на тазавых костках [27, с. 83–87].

Такая сітуацыя характэрна як для сельскіх, так і для гарадскіх некропалей.

Наяўнасць труны прасочваецца па драўнянаму тлену і/або жалезных цвіках. Можна казаць аб існаванні трун двух канструкцый: выдаўбленых з цэльнага дрэва і збітых з дошак. Выдаўбленыя труны зафіксаваны як на гарадскіх некрапалях (даследаваныя С.В. Тарасавым пахаванні на месцы дамініканскага кляштара ў Полацку), так і на сельскіх могільніках (каля в. Доўгае Глыбоцкага раёна) [28, с. 132; 29, с. 176]. Выробленыя з дошак труны сустракаюцца значна часцей. Колькасць цвікоў часта невялікая (1–2) і відавочна недастатковая для змацавання ўсіх дошак (Лучна I, Лучна II, Івесь, Доўгае, могілкі на стрэлцы Ніжняга замка), што характэрна і для гарадскіх, і для сельскіх могільнікаў [2, с. 180; 10, с. 122; 22, с. 22; 29, с. 174–176].

Надмагіллі. Адметнасцю шэрагу сельскіх могільнікаў (Івесь, Доўгае, Жарнасекава, Клешчыно, Дубраўка, Міхалінава і інш.) з’яўляюцца разнастайныя каменныя надмагіллі. Форма і канфігурацыя іх канструкцый адрозніваецца нават у межах аднаго помніка. Напрыклад, на могільніку Доўгае зафіксаваны наступныя варыянты каменных надмагілляў:

- вялікія камяні ў галавах і нагах пахавання і абкладка магільнага насыпа, выкананая з камянёў меншых памераў;
- вялікія камяні ў галавах пахавання і абкладка магільнага насыпа;
- вялікія камяні ў галавах пахавання і вымастка над магільным насыпам;

PolotskSU



- абкладка магілы камянямі;
- вымастка магілы камянямі;
- вялікі камень у галавах пахавання;
- каменны крыж [29, с. 170–174].

Для гарадоў каменыя надмагільныя канструкцыі нехарактэрны.

Высновы. Такім чынам, пахавальны абрад гарадскіх і сельскіх могільнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. дэманструе рысы як падабенства, так і адрознення. Адрозненні палягаюць найперш у большай варыятыўнасці сельскіх пахавальных помнікаў. Гарадскія пахаванні прадстаўлены грунтовымі магіламі, размешчанымі каля храмаў, у храмах ці на пляцоўках, не звязаных з культавымі будынкамі. Сельскія пахаванні даследуемага перыяду прадстаўлены не толькі грунтовымі могілкамі, але і могільнікамі на пляцоўках вялікіх курганоў, гарадзішчаў, пахаваннямі, упушчанымі ў насып курганоў папярэдняга перыяду, магчыма, у рэдкіх выпадках — познесярэдневяковымі курганамі. Сельскія пахаванні, у адрозненне ад гарадскіх, у меншай ступені прывязаны да храмаў і часта маюць надмагільныя канструкцыі, якія не характэрны для горада. Глыбіня магілы залежыць ад метрычных параметраў пахаванага і наяўнасці некалькіх гарызонтаў пахаванняў, што можа сустракацыца як на гарадскіх, так і на сельскіх могільніках. У засыпцы магільных ям сельскіх могільнікаў сустракаюцца фрагменты керамікі, што сведчыць аб памінальных рытуалах. І ў горадзе, і ў вёсцы пахаванні арыенціраваны адносна бакоў свету. Пераважае заходні напрамак. Усходні фіксуецца як адзнака прыналежнасці памерлага да каталіцкай ці ўніяцкай канфесіі. Адхіленні ад дакладных напрамкаў тлумачацца сезоннымі ваганнямі ва ўзыходзе і заходзе Сонца. Палажэнне рук адрозніваецца варыятыўнасцю, але пераважна зводзіцца да размяшчэння рук на тазавых касцях, жываце або грудзях у розных спалучэннях. У цэлым, пахавальны абрад XIV–XVIII стст. выяўляе падабенства з пахавальнымі традыцыямі папярэдняй эпохі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Вайцяховіч, А. В. Пахавальны абрад / А. В. Вайцяховіч // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя. У 2 т. — Мінск : БелЭн, 2009–2011. — Т. 2. Л — Я. — 2011. — С. 177–178.
2. Климов, М. В. Погребальные памятники полоцкой округи XIII–XVIII вв. / М. В. Климов, В. В. Черевко // Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV–XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке / О. Н. Левко [и др.] ; редкол. : А. А. Коваленя (гл. ред.) ; науч. ред. О. Н. Левко. — Минск : Беларуская навука, 2012. — С. 176–182.
3. Дучыц, Л. У. Да пытання аб познесярэдневяковых курганах Паўночнай Беларусі / Л. У. Дучыц // Весці Акадэміі навук БССР. Серыя грамадскіх навук. — 1989. — № 4. — С. 77–83.

PolotskSU



4. Чараўко, В. У. Да пытання аб раскопках М. Ф. Кусцінскім познесярэдневяковых курганных пахаванняў у Лепельскім павеце / В. У. Чараўко // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. — 2011. — Вып. 21. — С. 160–162.
5. Ласкавы, Г. В. Курганы з каменнымі выкладкамі на паўночным усходзе Беларусі (па матэрыялах курганнага могільніка Вышадкі) / Г. В. Ласкавы, І. М. Лаппо // Гістарычна-археалагічны зборнік. — Мінск, 1994. — № 3. — С. 148–160.
6. Чараўко, В. У. Археалагічныя раскопкі на могільніку каля в. Жарнасекава Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці ў 2013 г. / В. У. Чараўко // История и культура на стыке эпох и цивилизаций: историко-культурное наследие как ресурс и результат развития общества. Материалы Международной научно-практической конференции, посвящённой 250-летию М. К. Огинского (Минск, 25–26 сентября 2015 г.). — Минск : Белнаучкнига, 2015. — С. 122–127.
7. Археалогія Беларусі. У 4 т. — Мінск : Беларуская навука, 1997–2001. — Т. 4. Помнікі XIV–XVIII стст. / В. М. Ляўко [і інш.] ; пад рэд. В. М. Ляўко [і інш.]. — 2001. — 597 с. ; іл.
8. Ляўко, В. М. Новы Болецк / В. М. Ляўко // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя. У 2 т. Т. 2. Л — Я / рэдкал. : Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2011. — С. 137.
9. Клімаў, М. В. Лучна / М. В. Клімаў // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя. У 2 т. Т. 2. Л — Я / рэдкал. : Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2011. — С. 29–30.
10. Клімаў, М. В. Лучанскі грунтовы могільнік II : пытанні археалагічнай інтэрпрэтацыі / М. В. Клімаў // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы навуковых канферэнцый / рэдкал. : Г. У. Савіцкі [і інш.]. — Мінск : Нацыянальная бібліятэка, 2013. — С. 121–125.
11. Гардзееў, М. Ю. Шляхецкія тэстаменты ў актавай кнізе полацкага магістрата за 1656–1657 гады / М. Ю. Гардзееў, Н. У. Сліж // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. Исторические науки. — 2013. — № 1. — С. 29–36.
12. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Вып. 22. — Витебск : В типолитографии Г. А. Малкина, 1891. — X с. + 501 с. + XXXV с.
13. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Вып. 31. — Витебск : Губернская типолитография, 1903. — VIII с. + 449 с. + 94 с. + XXVI с.
14. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Вып. 21. — Витебск : В типолитографии Г. А. Малкина, 1891. — X с. + 500 с. + XL с.
15. Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст. (з актавых кніг Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) / склад. : А. Ф. Аляксандрава, В. У. Бабкова, І. М. Бобер. — Мінск : БелЭн, 2012. — 736 с. ; іл.
16. Дук, Д. У. Могілкі на стрэлцы Ніжняга замка ў Полацку / Д. У. Дук, В. А. Емяльянчык, А. Л. Коц // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. — Мінск, 2018. — Вып. 29. Даследаванні пахавальных і пасяленчых помнікаў эпохі сярэдневякоўя і Новага часу на тэрыторыі Беларусі і суседніх краін. — С. 171–182.

PolotskSU




17. Дук, Д. У. Полацк і палачане (IX–XVIII стст.) / Д. У. Дук — Наваполацк : ПДУ, 2010. — 180 с. ; іл.
18. Клімаў, М. В. Археалагічныя даследаванні гарадзішча і Вялікага пасада Полацка ў 2009 г. / М. В. Клімаў // Середньовічні міста Полісся : тези доповідей міжнародної наукової археологічної конференції. — Кіїв ; Олевьск, 2011. — С. 29–31.
19. Левко, О. Н. Витебск / О. Н. Левко. — Минск : Беларуская навука, 2010. — 335 с. ; ил.
20. Гордеев, М. Ю. Новые данные к биографии Симеона Полоцкого: завещание матери просветителя / М. Ю. Гордеев // Славяноведение. — 1999. — № 2. — С. 37–47.
21. Hedemann, O. Testamenty brasławsko-dziśnieńskie XVII–XVIII wieku jako źródło historyczne / O. Hedemann. — Wilno : Księgarnia św. Wojciecha, 1935. — 36 s.
22. Клімаў, М. В. Лучанскі грунтовы могільнік I / М. В. Клімаў // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы навуковых канферэнцый / рэдкал. : Г. У. Савіцкі [і інш.]. — Мінск : Нацыянальная бібліятэка, 2013. — С. 20–23.
23. Черевко, В. В. Археологические исследования на могильнике возле д. Дубровка Городокского района в 2014 г. / В. В. Черевко // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. — 2016. — № 1. — С. 153–161.
24. Генинг, В. В. Метод определения древних традиций ориентировок погребённых по сторонам горизонта / В. В. Генинг, В. Ф. Генинг // Археология и методы исторических реконструкций : сб. научных трудов / отв. ред. В. Ф. Генинг. — Киев : Наукова думка, 1985. — С. 136–152.
25. Івакін, В. Г. Християнські поховальні пам’ятки давньоруського Києва / В. Г. Івакін. — Київ : КИТ, 2008. — 272 с. ; іл.
26. Панова, Т. Д. Царство смерти. Погребальный обряд средневековой Руси XI–XVI веков / Т. Д. Панова. — М. : Радуница, 2004. — 181 с. ; ил.
27. Чараўко, В. У. Раскопкі на могільніку каля вёскі Івесь Глыбоцкага раёна ў 2013 годзе / В. У. Чараўко // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. — 2017. — № 1. — С. 82–88.
28. Чараўко, В. У. Археалагічныя разведкі на грунтовым могільніку каля в. Доўгае Глыбоцкага раёна ў 2010 г. / В. У. Чараўко // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зборнік навуковых прац Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Полацк, 21–23 красавіка 2011 г. У 2 ч. Ч. 1 / Пад агульнай рэдакцыяй Д. У. Дука, У. А. Лобача. — Наваполацк : ПДУ, 2011. — С. 130–134.
29. Чараўко, В. У. Археалагічныя раскопкі на могільніку каля вёскі Доўгае Глыбоцкага раёна ў 2015 г. / В. У. Чараўко // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зборнік навуковых артыкулаў III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Полацк, 14–15 красавіка 2016 г. : у 2 ч. Ч. 1 / пад агульнай рэдакцыяй Д. У. Дука, У. А. Лобача, А. І. Корсак. — Наваполацк : ПДУ, 2016. — С. 170–177.

PolotskSU



Работа выканана ў межах Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» на 2016–2020 гг. (падпраграма 12.1. «Гісторыя і культура», заданне 1.1.01. «Беларускія землі ў першабытную эпоху, сярэдневякоўе і ранні Новы час: археалагічныя помнікі, тэрыторыя, насельніцтва, эканоміка і культура», навукова-даследчая работа «Насельніцтва Полацкага Падзвіння ў I–II тыс. н.э.»).

## ELEMENTS OF THE FUNERAL CEREMONY OF THE URBAN AND RURAL POPULATION OF THE BELARUSIAN DVINA REGION OF THE 14$^{th}$–18$^{th}$ CENTURIES

*V. CHARAUKO*

*The article is devoted to the elements of the funeral ceremony of the rural and urban population of the Belarusian Dvina region of the 14$^{th}$–18$^{th}$ centuries. The categories of funerary monuments, the orientation of the skeleton relative to the cardinal points, the position of the arm bones, the depth and a filling of a grave pits, the presence of coffins and tomb structures are considered. Most of the elements of the funeral ceremony of the urban and rural populations are the same. For towns, churchyards are more, though not necessarily, and for the countryside, cemeterys. Many rural cemeteries are distinguished by gravestone constructions, the presence of which is not typical for urban necropolises.*

***Keywords**: Belarusian Dvina region, funeral ceremony of the 14$^{th}$–18$^{th}$ centuries, funerary monuments, burials, gravestone constructions.*